ский», «Споровский», которые входят в список Рамсарских территорий – особо охраняемых водно-болотных территорий международного значения.

«Зеленые маршруты», «отдых в деревне» на территории Брестской области потенциально могут быть востребованы в первую очередь на международном рынке туристических услуг. Следует отметить, что существует и внутренний спрос в сфере аргоэкотуризма: социологические опросы, проведенные в г. Бресте (2004 г.) показали, что 45.6% опрошенных горожан выразили желание отдохнуть в белорусской деревне, если бы для этого были бы созданы необходимые условия. К их услугам в настоящее время – около 30 сельских усадеб, которые официально объявили о предоставлении подобного рода услуг. Постоянно увеличивается число СПК, артикулирующих свой интерес к области сельского туризма.

Причин невысокого уровня развития агроэкотуризма в Брестском регионе несколько. Наиболее значимыми являются его недостаточная информационная составляющая, слабость инфраструктуры сельского туризма и, безусловно, оторванность друг от друга экологического и сельского туризма. Речь идет о том, что, с одной стороны, хозяева сельских усадеб не обладают необходимой экологической компетентностью. С другой стороны, экологический туризм игнорирует инфраструктуру сельского туризма: экологические маршруты не включают в себя сельские усадьбы. Поэтому необходимо разработать серию экологических маршрутов, замкнутых в сеть существующих сельских усадеб. При этом предполагается их (маршрутов) всестороннее описание (краеведческое, историко-культурное, природно-географическое) и предоставление этой информации хозяевам агроусадеб и туристическим фирмам. Для решения этой задачи целесообразно использовать серию велосипедных, пеших и водных экспедиций.

Это направление достаточно интенсивно развивается и в Брестской области. В регионе расширяется сеть агроусадеб, хозяева которых стремятся предоставить гостю не только постель и пищу, но и разнообразную культурную программу. Наиболее перспективен, как показывает опыт последнего времени, следующий метод организации отдыха отечественных и зарубежных посетителей сельских усадеб. Это передвижение небольших групп (10-15 человек) на велосипедах, останавливаясь на ночлег в агроэкоусадьбах. Эта модель также позволяет успешно реализовать культурно-познавательную функцию туристической деятельности, дать возможность нашим гражданам, а также зарубежным гостям познакомиться с историко-культурными ценностями Брестчины, ее сохранившимися архитектурными памятниками, народными традициями и выдающимися личностями.

УДК [72 8.83+712] (476.7)
***Папко В.М., БрДТУ, г. Брэст***

## ГІСТОРЫЯ ЎЗВЯДЗЕННЯ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ВЫКАРЫСТАННЯ КОМПЛЕКСА БУДЫНКАЎ БЫЛОГА МАЁНТКУ ЧАХЕЦ ПАМЕШЧЫКАЎ ДЗЯКОНСКІХ

Рэшткі памешчыцкай сядзібы ў в. Каштанаўка Пружанскага раёна некалькі дзесяцігоддзяў прыцягвалі ўвагу грамадскасці. Між іншым, колькасць такіх будынкаў у Пружанскім раёне вельмі малая. Сядзіба знаходзіцца на землях мясцовага калгаса, і гэтае гаспадаранне прывяло дом да разбурэння. Самастойна калгас не ў стане аднавіць гэта будынак, таму было прынята рашэнне перадаць яго ў арэнду мясцоваму прадпрымальніку І. Мартынюку. Новы гаспадар задумаў тут зрабіць гасцініцу, аднак і на сённяшні дзень справа не зрушылася з месца.

Сядзіба ў в. Каштанаўка (гістарычная назва – Чахец) пабудавана не раней за сярэдзіну XIX ст. У 1855-1856 г. гэтыя землі ў памешчыкаў Булгарыных купіў Алаізі Кернажыцкі (1802–1871).* Каля 1860-х гг. адзіная дачка Кернажыцкага, Марыя–Ганна (1840–1887) пайшла замуж за кобрынскага памешчыка Альбіна Дзяконскага, які займаў высокае становішча сярод шляхты. У 1878–1884 гг. ён быў маршалкам шляхты, або як гаварылі ў Расійскай імперыіі – "предводителем дворянства" Кобрынскага павета. Пасля смерці Кернажыцкага маёнткі перайшлі да роду Дзяконскіх і належылі сыну і ўнуку Альбіна.

---

* У метрычных кнігах мясцовай праваслаўнай парафіі пазначалася, каму належыў прыгонны, які нарадзіўся, памёр або ўзяў шлюб. Імя А. Кернажыцкага як гаспадара ўзнікае ў 1855-1856 гг.

Даследчыкі не знайшлі дакументаў, якія б дазволілі дакладна меркаваць аб даце пабудовы сядзябнага дому. Л.М. Несцярчук выказаў меркаванне, што маёнтак Чахец перайшоў да Альбіна Дзяконскага (?-1918) у якасці пасага яго жонкі Марыі-Ганны Кернажыцкай [1]. Аднак, хутчэй за ўсё, ён стаў афіцыйнай маёмасцю Дзяконскіх толькі пасля смерці Кернажыцкай у 1887 г. Верагодна, Марыя-Ганна праводзіла тут большую частку свайго жыцця. Яна нават пахавана каля сваіх бацькоў на мясцовых каталіцкіх могілках у мястэчку Шарашова, а не ў Кобрыне, дзе знайшлі спакой многія прадстаўнікі роду Дзяконскіх.

Некаторыя аўтары лічаць, што памешчыцкі дом быў пабудаваны або дабудаваны А. Дзяконскім. Польскі даследчык Р. Афтаназы таксама лічыў, што гэты аднапавярховы дом пабудаваны ў сяр. XIX ст. Альбінам. Галоўны ўваход быў упрыгожаны чатырма слупамі – па два з кожнага боку. Ад тылу дома была тэраса, дах якой не захаваўся. З левага боку асноўнага будынку пазней была ўзведзена двухпавярховая дабудова, якая надавала ўсяму збудаванню асіметрычны характар. Дом быў накрыты двусхільным дахам. Да I сусветнай вайны чахецкі памешчыцкі дом быў поўны прыгожай мэблі, твораў мастацтва і старажытнага серабра. Пасля вайны шмат што было страчана. Па звестках Р. Афтаназы, засталіся толькі рэшткі мэблі ў стылі ампір, якая ўпрыгожвала салон, белы ў кветкі спальны гарнітур і кнігазбор.

Пад'яздная алея раней выходзіла проста да цэнтральнага ўваходу. Зараз дарога агібае дом з левага боку. Перад домам знаходзілася парадная частка парку, ад тылу дома – пейзажная, дзе вылучалася букавая алея, што вяла да альтанкі [2]. Выгляд парку быў падрабязна апісаны А. Т. Федаруком [3].

З гэтым домам было цесна звязана жыццё Мар'яна Тадэвуша Дзяконскага, які атрымаў яго ў спадчыну ад маці. На жаль, захаваліся вельмі скупыя звесткі аб жонцы Мар'яна Тадэвуша. Яна паходзіла са шматлікага шляхецкага роду Корсакаў. Папулярную на беларускіх землях прымаўку пра разгалінаваныя шляхецкія роды згадвае ў сваёй кнізе Федарук: "Co krzaczek – to Korsaczek, co gruncik – Skirmuncik, co morda – to Orda". Аднак гэтая жанчына, не пакінуўшы аб сабе памяці, усё ж у гісторыю трапіла – дакладней, у гісторыю мастацтваў. Вядомы мастак рубяжа XIX і XX ст. Конрад Кшыжаноўскі (1872-1922) намаляваў "Партрэт Яніны з Корсакаў Дзяконскай", які атрымаў гонар захоўвацца ў галоўнай мастацкай галерэі Польшчы – Нацыянальным музеі ў Варшаве. Партрэт Я. Дзяконскай датаваны 1908-1910 г. Не вядома, дзе ён быў напісаны. Магчыма, праца над партрэтам вялася ў Варшаве, дзе часта бывалі як мастак, так і Дзяконскія. Вядома таксама, што мастак часта вандраваў па Валыні і Палессі, дзе перажыў гады I сусветнай вайны. Магчыма, К. Кшыжаноўскі наведваў Чахец [4].

У 1919 г. Мар'ян Тадэвуш прадаў большую частку сваіх уладанняў на Пружаншчыне прадпрымальніку з г. Магільна Юзэфу Драхейму. Аднак ён пакінуў сабе маёнтак Чахец з прылеглымі землямі. Дом быў разрабаваны ў гады вайны, многія гаспадарскія пабудовы былі спалены. У 1921 г. Мар'ян Тадэвуш памёр у Варшаве. Яго сын Януш выступаў супраць продажу зямель і адразу пачаў судзіцца з Драхеймам, імкнучыся вярнуць родавыя ўладанні. У 1926 г. пасля шматлікіх судовых паседжанняў Дзяконскі і Драхейм заключылі прымірэнчае пагадненне. Частка набытых Драхеймам зямель была вернута Янушу.

Польскія ўлады ў 1920-я гг. праводзілі аграрную рэформу, сутнасць якой была парцэляцыя і продаж вялікіх памешчыцкіх маёнткаў. Дзяконскі паставіў сабе мэту ўберагчы свой маёнтак ад зямельнай рэформы. Перад ім стаяла нялёгкая задача па аднаўленні маёнтку, які быў значна пашкоджаны падчас I сусветнай вайны. Матэрыяльных сродкаў яму не хапала – вядзенне судовага працэсу каштавала яму не толькі часу і нерваў, але і вялікіх сродкаў. Аднак для адхілення парцэляцыі мелася законная "лазейка". Пастанова аб правядзенні сельскагаспадарчай рэформы прадугледжвала магчымасць пазбегнуць поўнай парцэляцыі для тых маёнткаў, ў якіх гаспадарка вядзецца на высокім узроўні, а апрацоўка зямлі з'яўляецца ўзорнай. Пры гэтым дазвалялася пакінуць гаспадару не болей за 300 га ворыўнай зямлі.

Будынкі і гаспадарка маёнтку былі значна пашкоджаны падчас вайны – згарэла каля 10 будынкаў. Аднак да 1929 г. усе яны былі адноўлены, актыўна вяліся працы па аднаўленні спіртзаводу. У ліпені 1930 г. Міністэрства аграрных рэформаў пряняло рашэнне пакінуць Я. Дзяконскаму 313 га зямлі для вядзення гаспадаркі [5].

Не выяўлены пакуль што дакументы ці мемуары, якія б паведамлялі пра стыль жыцця і адносіны гаспадароў маёнтка Чахец. Аднак удалося знайсці мясцовых жыхароў, родзічы якіх у 1920–1930-я гг. мелі дачыненне да Дзяконскіх. Так, у канцы 1920-х гг. у маёнтку выконвала працу жыхарка вёскі Чахец

Васіліна Ціханчук. Спачатку яна працавала ў доме, а потым на агародзе. У Чахцы выраблялі шмат віна з вішань і чырвоных парэчак, яно стаяла ў вялікіх шкляных бутэльках. Дзякуючы яе ўспамінам вядома, што ў парку гадаваліся прыгожыя ружы. У маёнтак на працу хадзіла шмат людзей з вёскі Чахец. Частка іх, якія не мелі сваіх хат, жылі ў доміках пры двары. Пасля 1939 г. яны засталіся жыць у гэтых дамах і заснавалі вёску Каштанаўка. Жыццё вясковых жыхароў моцна залежыла ад панскага двара. Каб трапіць за ягадамі ў панскі лес, трэба было купляць квіток. Калі гаёвы (ляснік) сустракаў у лесе ягаднікоў без квітка, то адбіраў ягады і адносіў у маёнтак.

Раман Ціханчук у маёнтку даглядаў коней. Ён узгадваў, што гаспадары не вельмі ладзілі адзін з адным. Пан часта з'язджаў у Варшаву, дзе ў яго быў дом. Пані была прыгожая, заўсёды хадзіла ў доўгіх сукенках, прытрымлівалася дыеты. Аднойчы раніцай Раман і іншыя работнікі канюшні выпадкова бачылі, як пані бегла па парку ў шыкоўным пеньюары, а пан доўга яе шукаў, гукаў. Ён прыйшоў да высновы, што Дзяконскія пасварыліся. На ўсё жыццё яго ўразіла гэта сцэна: шыкоўная жанчына ў прыгожай сукенцы бяжыць па парку.

Пані кіравала ўсім жыццём маёнтка. Да 1939 г. яна заказвала цыган на святы. Да гаспадароў прыходзілі афіцэры кавалерыйскага палка, які стаяў недалёка, зімой наладжваліся балы. Часам пані Марыя на зіму ездзіла ў Парыж, а маёнткам кіравалі яе даверанья асобы – аграном і агароднік, якія па паходжанню былі палякі, і пільнавалі гаспадарку. У маёнтку быў нават тэлефон – даволі рэдкая рэч па тых часах. У тэлефоннай кнізе г. Пружаны за 1937 г. пазначаны нумар 53, па якім можна было звязацца з гаспадаром Чахца*.

Калі прыйшла савецкая ўлада ў 1939 г., Марыю Дзяконскую прымусілі капаць бульбу. Людзі ёй спачувалі, дапамагалі. Яна вельмі схуднела, хадзіла ўся ў чорным адзенні. У доме жылі савецкія вайскоўцы, а пані Марыі выдзелілі пакой, таму што ёй не было куды падзецца. На той час пані была адна, дзе знаходзілася яе дачка – невядома. Хутчэй за ўсё, яна жыла ў Варшаве. Праз некаторы час знікла і пані Марыя. Мясцовыя жыхары не ведалі, ці яе арыштавалі, ці яна з'ехала ў Варшаву.** Марыя Дзяконская разам з дачкой пераржыла вайну ў Польшчы, аднак пасля яе заканчэння пераехала ў Аргенціну, дзе і памерла (год не вядомы). Лёс Януша Дзяконскага пасля падзей 1939 г. не вядомы. Верагодна, ён загінуў у невядомай савецкай турме.

Апошняя прадстаўніца роду Дзяконскіх, якая звязана з гэтым домам, была адзіная дачка Януша і Марыі Дзяконскіх – Яніна Іаланда, якая нарадзілася ў Чахцы 14 лютага 1925 г. У 1949 г. яна скончыла Варшаўскі універсітэт з дыпломам інжынера аграноміі і магістра агранамічных навук. У 1954-1957 гг. Дзяконская выкладала іхтыялогію (навуку аб рыбах) у Вышэйшых школах аграноміі г. Ольштын і Варшавы, а таксама на біялагічным факультэце Варшаўскага універсітэту. У 1957 г. Яніна Дзяконская паехала ў Аргенціну, дзе пасля вайны пасялілася яе маці. Дзяконская пайшла замуж за Хасэ (Юзэфа) Ціхомскага і засталася ў Агренціне на ўсё жыццё. Там яе непрывычнае для іспанскай мовы імя перайначылі на свой манер і пачалі называць Хуанай. Яна насіла двайное прозвішча Дзяконска дэ Ціхомскі і так увайшла ў гісторыю.

Яніна Дзяконская вывучала рыб, што жывуць у Атлантычным акіяне, працавала ў Інстытуце марской біялогіі ў г. Мар-дэль-Плата, абараніла доктарскую дысертацыю. Пасля гэтага кар'ера Дзяконскай пайшла ўгару: яна ўзначальвала Біялагічную лабараторыю рыб і інктыяпланктону, да адыходу на пенсію ў 2001 г. працавала ў Нацыянальным інстытуце даследавання развіцця рыб (INIDEP). Дасягненні Яніны Дзяконскай-Ціхомскай былі высока ацэнены навуковай грамадскасцю. У 1991, 1995 і 1996 гг. Міжнародным Біялагічным цэнтрам у Кембрыджы яна была названа Міжнароднай Жанчынай года. 27 мая 2003 г., ва ўзросце 78 гадоў яна памерла ў Буэнас-Айрэсе [6]. Для гісторыі Пружаншчыны асоба Яніны Іаланты Дзяконскай – выключны выпадак. На наш погляд, гэтая жанчына была годнай прадстаўніцай памешчыцкага роду і варта ўстанаўлення памятнай дошкі, або нейкага знака на будынку дома, дзе яна нарадзілася і правяла сваё дзяцінства.

У 1980-1990-я гг. існавалі розныя прапановы па выкарыстанню дома і парка Дзяконскіх. На той момант яны ўжо знаходзіліся ў дрэнным стане. М. Багадзяж, карэспандэнт "Чырвонай змены" напісаў у

---

* Гэтая інфармацыя знойдзена аўтарам у Інтэрнэце.

** Успаміны Васіліны Ціханчук пераказала яе ўнучка, Зінаіда Пятроўна Палякова (у дзявоцтве Ціханчук), жыхарка г. Пружаны.

1990 г. артыкул пра дом і парк у Каштанаўцы, дзе апісаў тагачасны стан былога маёнтку. Калі меркаваць па гэтым апісанні, то за мінулыя 18 гадоў яго стан пагоршыўся. М. Багадзяж прыводзіць успаміны былой дырэктаркі мясцовага саўгаса Р. У. Корсак, якая расказала, як ішло разбурэнне дома. Каштоўная печка-галандка, упрыгожаная старажытнай кафляй, была разабрана і вывезена колішнім сакратаром райкама, старшынёй райвыканкама і галоўным урачом Магілявецкай бальніцы.

А.Т. Федарук у кнізе "Старинные парки Белоруссии" выказаў у 1985 г. прапанову аб выкарыстанні сядзібнага дома пад адміністрацыйнае памяшканне, М. Багадзяж прапаноўваў аддаць дом пад філіял нейкага музея [7]. Аднак гэта быў час эканамічнага крызісу і вялікіх палітычных пераўтварэнняў, што не дазволіла прафінансаваць рэстаўрацыю. Між іншым, сама індустрыя турызму на той час знаходзілася ў заняпадзе. На сённяшні дзень вельмі папулярнай з'яўляецца ідэя развіцця агра-экатурызму, гэтая сфера карыстаецца дзяржаўнай падтрымкай. Зручнае месцапалажэнне дазваляе ўключыць комплекс былога маёнтка Чахец у розныя турыстычныя маршруты, у тым ліку ў веласіпедныя.

У наш час існуе значна больш магчымасцей для развіцця веласіпеднага турызму, які будзе разлічаны ў першую чаргу не на мясцовае насельніцтва, а на прыезджых. Адзін з верагодных веласіпедных маршрутаў па Пружанскім раёне быў апрабіраваны 29 красавіка 2007 г. студэнтамі першага курса Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта. Маршрут быў складзены з улікам некалькіх умоў: ён не быў павінен быць складаным, таму што ўдзельнікі не з'яўляюцца спартсменамі; павінен быў уключаць аб'екты гісторыі і культуры, каб выканаць пазнавальна-выхаваўчую функцыю.

Веласіпедная экскурсія адбылася па маршруце **Брэст – Аранчыцы – Пружаны – Каштанаўка – Шакуны – Трусавіца – Прылутчына – Брэст.** Веласіпеды былі прадстаўлены універсітэцкім велаклубам, яны выраблены на брэсцкай фабрыцы «Еўрабайк». З Брэста студэнты на электрацягніку дабраліся да станцыі Аранчыцы, откуль пачалася велаэкскурсія. У Пружанах было арганізавана наведванне мяцовага краязнаўчага музея, размешчанага ў прыгожым «Пружанскім палацыку», пабудаваным у XIX ст. Студэнты аглядзелі і іншыя архітэктурныя помнікі горада Пружаны: сабор Аляксандра Неўскаго, «Белыя лаўкі» – старажытныя гандлёвыя рады. Наступным аб'ектам была в. Каштанаўка, руіны дому і парк Дзяконскіх.

Пасля Каштанаўкі група веласіпедыстаў накіравалася па трасе Пружаны-Відамля да паварота на вёску Шакуны. Гэта адзін з самых знакамітых населеных пунктаў Пружаншчыны. Маленькая вёсачка стала знакамітай дзякуючы таму, што ў ёй нарадзіўся Рыгор Шырма, фалькларыст, заснавальнік дзяржаўнага хора, які носіць его імя. Перад заездам у вёску стаіць камень, надпіс на якім паведамляе аб нараджэнні ў ёй Шырмы, захаваўся і яго бацькоўскі дом. Каля вёскі Шакуны ў будынках былога фальварка Дзяконскіх, зараз мясцовым прадпрыймальнікам А. Янушкевічам ствараецца аграсядзіба Трусавіца. Драўляныя будынкі ўзведзены ў 1920-1930-х гг., добра захаваліся і размешчаны ў жывапісным лесе.

Гаспадар сядзібы, А.А. Янушкевіч паказаў свае уладанні і некаторыя экспанаты свойго маленькага музея, расказаў пра быт сялян. Пасля некалькіх гадзін адпачынку, абеда і гульні ў валейбол, група накіравалася далей. Да вёскі Шакуны дарога была вельмі добрай, далей трэба было ехацьляснымі шляхамі па пяску. Гэтую дарогу мясцовыя жыхары называюць «напалеонаўскім трактам». У 1812 г. недалёка адсюль адбылася Гарадзечанская бітва паміж рускімі і французскімі вайскамі. Мясціны вельмі прыгожыя, вакол квітнелі першыя вясеннія кветкі, сустракаліся балоты, дзе можна было ўбачыць лотаць – жоўтую кветку, занесеную ў «Чырвоную кнігу». Велапаход скончыўся на станцыі Прылутчына, адкуль студэнты накіраваліся ў Брэст. Усяго на веласіпедах студэнты праехалі 36 км. Яны выказалі меркаванне, што такая экскурсія значна цікавейшая за аўтобусную, пакідае больш яркія ўспаміны і эмоцыі.

Пабудаваны ў другой пал. XIX ст., сядзібны дом у в. Каштанаўка па праву адносіцца да спісу архітэктурных помнікаў Пружаншчыны. З гэтым домам цесна звязана гісторыя роду памешчыкаў Дзяконскіх. Дом Дзяконскіх можа стаць не толькі турыстычным аб'ектам: гасцініцай або рэстаранам, але і аб'ектам культуры. Тым больш, што захаваліся і гаспадарчыя пабудовы вакол яго, якія дазваляюць аднавіць цэлую шляхецкую сядзібу XIX ст. Назапашаны гістарычны матэрыял дазваляе тут планаваць стварэнне мемарыяльнага пакоя, накшталт міні-музея, дзе можна было б размясціць невялікую экспазіцыю, прысвечаную гісторыі ўзвядзення дома і роду гаспадароў маёнтка – памешчыкаў Дзяконскіх. На наш погляд, тут было б добра паказаць копію партрэту Яніны Дзяконскай пэндзля

К. Кшыжаноўскага. Аднак для рэалізацыі гэтага праекта недастаткова толькі прыватных сродкаў і намаганняў цяперашняга арандатара І. Мартынюка. Для паспяховага і хуткага аднаўлення дому неабходны вялікія сродкі. Геаграфічнае палажэнне сядзібнага комплексу ў в. Каштанаўка дазваляе прадбачыць яго запатрабаванасць як турыстычнага аб'екта. Сядзіба знаходзіцца недалёка ад раённага цэнтра, які са з'яўленнем крытага катку і пабудовай басейна паступова пераўтвараецца ў атракцыйнае для турыстаў месца адпачынку.

Дом абкружаны вялікім, але занядбаным паркам. У непасрэднай блізкасці ад дома знаходзяцца гаспадарчыя будынкі, узведзеныя апошнім гаспадаром маёнтка, Янушам Дзяконскім. Яны прыстасаваны пад жыллё або выкарыстоўваюцца калгасам для сваіх патрэб. У другой палове 1920-х гг. Януш Дзяконскі аднавіў усе спаленыя падчас I сусветнай вайны будынкі, адрамантаваў спіртовы завод (пабудаваны ў 1911 г.) Ступень захаванасці гэтага комплексу можна лічыць даволі добрай. У самым горшым стане знаходзіцца сядзібны дом з 20 пакояў, у якім адсуднічае дах. У спалучэнні з гаспадарчымі пабудовамі, якім таксама можна надаць нейкія функцыі, рэшткі сядзібы маглі б стаць унікальнай для Брэстчыны зонай адпачынку.

## ЛІТАРАТУРА


1. Несцярчук Л.М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X-XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы). – Мн.: БЕЛТА. – 2002. – С. 284.
2. Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. Województwa brzesko-litewkie, nowogródzkie. Tom 2. Wrocław-Warszawa-Kraków. Zakład Narodowy imienia Ossolińskich. – 1992. – С. 32.
3. Федорук А.Т. Старинные усадьбы Берестейщины. Мн.: Беларуская энцыклапедыя. – 2006. – С. 420-423.
4. www.culture.pl/pl/culture/artykuly/os_krzyzanowski_konrad
5. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці. Ф. 60, воп. 1, спр. 647, С. 2-30.
6. www.inidep.gov.ar/publicaciones/revista/revista_16/yolanda16.htm
7. Багадзяж М. Паспець захаваць прыгажосць // Зара камунізму (Пружаны). – 1990. – 8 снежня. – С. 3.


## RESUME


The article presents the history of landowners Dziekonski manor in Kashtanovka (Pruzany district). The house is referred to the number of architectural monuments of this locale. In the present moment the building is in the bad condition, it is needed the restoration. The writer analyzes some pieces of the manor history and the destiny of its owners. The location of the manor allows to use it as a tourist plant.



УДК 772, 778



***Мисиюк В.С., БрГТУ, г. Брест***


## АКТУАЛЬНОСТЬ ИЗУЧЕНИЯ АРХИТЕКТУРЫ ТРАДИЦИОННОГО ДОМА ПРИБУЖЬЯ

Бурное развитие промышленности, использование новейших технологий, монополизм государственных строительных организаций, ограничение экономической активности частных лиц привели к тому, что в советский период в строительстве стали использоваться исключительно долговечные искусственные материалы: железобетонные конструкции, кирпич, газосиликатные блоки и т.п. Это привело к резкому сокращению числа деревянных сооружений.

Деревянная архитектура составляет важнейшую часть культурного наследия Прибужья. Спецификой региона является то, что в силу географических и исторических условий деревянными были абсолютное большинство сельских и городских сооружений. На западе Республики Беларусь Западное Полесье – это также традиционно регион деревянной сакральной архитектуры, в отличие от Понемонья, где в силу особых архитектурных традиций, а также распространенности римско-католических приходов процент этот заметно ниже. Роль дерева в строительстве нашего региона, и не только, была столь велика, что об этой части Европы можно смело говорить как о «деревянной цивилизации».

Наиболее социально-значимым типом деревянного сооружения нам представляется деревянный дом. Архитектурные приемы, применяемые при его строительстве, использовались как при создании хозяйственных построек (где они были представлены в упрощенном виде), так и при создании